# ЗАПРАШАЕМ НА АЛІМПІЯДЫ!

***Прыёмная кампанія 2023 года прадастаўляе абітурыентам унікальную магчымасць быць залічанымі ў абраную ўстанову вышэйшай адукацыі без экзаменаў. Пры ўмове, што яны стануць пераможцамі ўніверсітэцкай алімпіяды.***

У ВДУ імя П.М. Машэрава алімпіяда будзе праводзіцца для адзінаццацікласнікаў у два этапы. Першы пройдзе ў снежні гэтага года дыстанцыйна. Да ўдзелу дапускаюцца ўсе навучэнцы выпускных класаў, якія пройдуць рэгістрацыю самі ці праз законнага прадстаўніка на сайце (https://olimp.vsu.by/) з 28 лістапада да 22 снежня 2022 года.

Пасля рэгістрацыі ўдзельнікі атрымаюць доступ да алімпіядных заданняў (будзе адкрыты з 1 па 29 снежня). Кожны прадмет алімпіяды навучэнец можа прайсці толькі адзін раз. Дапускаецца ўдзел у некалькіх алімпіядных прадметах. Вынікі першага этапу будуць апублікаваны не пазней 7 працоўных дзён пасля яго завяршэння.

Заключны этап пройдзе ў лютым 2023 года ў вочнай форме на базе ВДУ імя П.М. Машэрава ў адпаведнасці з графікам. Да другога этапу дапускаюцца ўдзельнікі, якія ў ходзе выканання заданняў першага этапу пераадолеюць кваліфікацыйны мінімум (на падставе рэйтынгу набраных балаў).

Пераможцамі алімпіяды стануць навучэнцы, якія набяруць найбольшую сумарную колькасць балаў (але не менш за 50% ад агульнай сумы балаў) і атрымаюць дыпломы I, II, III ступені. Па выніках алімпіяды пераможцы будуць залічаны без уступных экзаменаў на адну з 17 спецыяльнасцяў універсітэта.

Па словах Вікторыі Яноўскай, сакратара аргкамітэта ўніверсітэцкай алімпіяды, алімпіяда – гэта не ЦТ (заданні пабудаваны па на ведах вучэбнага прадмета з алімпіядным характарам), а магчымасць праявіцца адораным і таленавітым абітурыентам. Гэта інтэлектуальны конкурс, які дае магчымасць паказаць узровень ведаў па прадмеце, праявіць нестандартнае мысленне, набыць новы вопыт і атрымаць магчымасць навучацца за кошт дзяржаўнага бюджэту па спецыяльнасці, якая адпавядае выбранаму прадмету.

Па ўсіх пытаннях можна звяртацца па тэлефоне: **8 (0212) 37 03 96.**

Падрабязную інфармацыю глядзіце на сайце ВДУ з дапамогай QR-кода.